# СА СВЯТАМ ЦЯБЕ, МОЛАДЗЬ БЕЛАРУСІ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі Універсітэт

Год выдання другі
№ 4 (45)
ЧАЦВЕР 24 ВЕРАСНЯ 1970 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Цана 2 кап.

Чырванасцяжнаму камсамолу нашай рэспублікі ў дзень яго пяцідзесяцігоддзя прысвячаецца гэты нумар

## МОВАЙ ЛІЧБАЎ І ФАКТАЎ

Камсамольская арганізацыя універсітэта налічвае 2542 члены ВЛКСМ.

* * *

1963 камсамольцы мелі ў мінулым годзе пастаянныя камсамольскія даручэнні.

* * *

Першы студэнцкі будаўнічы атрад асвоіў 144 тысячы рублёў капіталаўкладанняў. У складзе яго было 106 чалавек.

* * *

У трэцім семестры, прысвечаным 50-годдзю ЛКСМБ, удзельнічала ў студэнцкіх будаўнічых атрадах 524 чалавекі. Імі было асвоена звыш 850 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.

* * *

З 1963 па 1970 год школу працоўнага выхавання ў студэнцкіх будаўнічых атрадах прайшло больш 1300 чалавек.

* * *

26 байцоў будаўнічых атрадаў узнагароджаны медалем «За асваенне цалінных зямель».



## СПРАВАЙ ДОБРАЮ ЗАЎЖДЫ СЛАВІЦЦА

Есць у нас касцяк
З мужнай воляю —
Моладзь з назваю —
Камсамолія!
І жыве яна,
І не старыцца,
Справай добраю
Заўжды славіцца.
Здзяйсненням моладзі
Канца няма,
Ні адпачынку.
Яна сама
Адолець хоча
Усе бар'еры,
Дарогі часу
Нагамі змераць,
Пазнаць Зямлю
І чалавека,
Законы ветру,
Законы веку.
І крочыць моладзь
Мая наперад,
Каб зведаць шчасце
І ў шчасце верыць.

Н. ШКЛЯРАВА,
студэнтка-завочніца 5 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.

## САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партыйны камітэт і мясцовы камітэт сардэчна віншуюць камсамолію універсітэта ў дзень 50-годдзя Чырванасцяжнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі і жадаюць камсамольскай арганізацыі далейшых поспехаў у вучэбна-выхаваўчай рабоце. Жадаем вам, дарагія таварышы, дастойна працягваць слаўныя традыцыі камсамольцаў старэйшых пакаленняў!**



У вялікай гарадской маніфестацыі, якая была прысвечана паўвекаваму юбілею Чырванасцяжнага ленінскага камсамола Беларусі, прыняла ўдзел і камсамольская арганізацыя нашага універсітэта.

НА ЗДЫМКУ: камсамольцы універсітэта на маніфестацыі.

## КАМСАМОЛУ РЭСПУБЛІКІ—50 ГОД

Сёння спаўняецца 50 год Ленінскаму Камуністычнаму Саюзу Моладзі Беларусі. Гэта вялікае свята моладзі нашага універсітэта.

50 год камсамол Беларусі адзначае ў юбілейным ленінскім годзе, калі ўся наша партыя, увесь савецкі народ рыхтуюцца сустрэць XXIV з'езд КПСС. Камсамольская арганізацыя універсітэта — гэта вялікая і згуртаваная сям'я савецкага студэнцтва. Адданая справе Камуністычнай партыі, яна свята ахоўвае і прымнажае слаўныя рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі савецкага народа. Студэнты добра памятаюць вялікую і адказную задачу, пастаўленую У. І. Леніным перад моладдзю — вучыцца камунізму.

Заклікаючы да глыбокага засваення ўсіх багаццяў чалавечай культуры, вялікі Ленін пісаў, што камуністам можна стаць толькі тады, калі ўзбагаціш сваю памяць ведамі ўсіх тых багаццяў, якія выпрацавала чалавецтва.

Камсамольцы універсітэта прынялі рашэнне ўнесці свой пасільны ўклад у гонар XXIV з'езда КПСС — дабіцца новых поспехаў у вучэбна-выхаваўчай і грамадска-палітычнай працы, яшчэ вышэй узняць актыўнасць усёй студэнцкай моладзі.

За 50 год камсамол Беларусі прайшоў вялікі і цяжкі шлях. Ён унёс вялікі ўклад у справу абароны Радзімы, перамогу над ворагам у грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнах, адыграў вялізную ролю ў аднаўленні народнай гаспадаркі як у першай, так і ў астатніх пяцігодках: у індустрыялізацыі, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, культурнай рэвалюцыі. Заўсёды і ўсюды камсамол быў першым памочнікам нашай партыі.

Мы жывём і будуем у гераічную эпоху, у эпоху супрацьборства дзвюх сістэм. Мы жывём, упэўненыя ў заўтрашнім дні, будуем на стагоддзі. Мы ведаем, якая небяспека яшчэ існуе, пакуль існуе буржуазнае грамадства.

Наша краіна, нашы поспехі ў гаспадарчым будаўніцтве, навуковым і культурным жыцці аказваюць вялікі, рашаючы ўплыў на ход сусветнай гісторыі, як гэта геніяльна прадбачыў У. І. Ленін. Ён гаварыў: «...Мы працуем не толькі для сябе і для нашых сучаснікаў, або, вярней, не столькі для іх, колькі для працоўных усяго свету і для яго будучых лёсаў».

Наш народ будуе камунізм. У сувязі з гэтым адказныя задачы заклікан рашаць камсамол. Перад нашай Радзімай стаяць задачы, якія яшчэ ніколі не стаялі перад чалавецтвам — будаўніцтва камунізма. Гэтыя задачы пад кіраўніцтвам КПСС рашаюцца. Шлях да камунізма асвятляе навуковая тэорыя марксізма-ленінізма. Поплеч з камуністамі адным шляхам ідзе камсамол. Для камсамола няма больш высокага гонару, як свята працягваць гэты паход, заставацца заўсёды і ва ўсім верным і надзейным памочнікам нашай партыі.

Партыйная арганізацыя універсітэта бачыць у камсамольцах свайго баявога памочніка ў рашэнні задач, пастаўленых партыяй і ўрадам перад вышэйшымі навучальнымі ўстановамі.

Са святам цябе, універсітэцкая камсамолія, з вялікім юбілеем!

Я. ЕРМАЛАЕЎ,
сакратар парткома універсітэта.

